# «І ТАК ПАМЁР ЗАКОН СТАРЫ. І ТАК СТАЎ НОВЫ ЗАКОН»

## (урок па казцы Уладзіміра Караткевіча «Нямоглы бацька»)

Мэты; *адукацыйная:* спрыяць спасціжэнню вучнямі ідэі твора, аўтарскай пазіцыі, маральнай высновы казкі, яе гуманістычнага пафасу; характарызаваць герояў паводле іх паводзін і ўчынкаў; *развіццёвая:* развіваць камунікатыўныя здольнасці вучняў, чытацкія ўменні; *выхаваўчая:* далучыць вучняў да маральна-этычных праблем сучаснасці, дапамагчы ўсведамленню свайго месца ў жыцці і лёсе пакаленняў; размяжоўваць і ацэньваць дабро і зло.

Тып урока: аналіз літаратурнага твора.

Эпіграф:

Шануйце дабрыню, хай і слабую.
Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую.
Насіце на руках бацькоў...

*(Уладзімір Караткевіч).*

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант. Уступнае слова настаўніка.**

Настаўнік. Пачаць наш урок мне хочацца каля фотавыставы, якую мы падрыхтавалі разам з вамі. Скажыце, калі ласка, каму прысвечана наша фотавыстава? *(Бабулям, дзядулям, бацькам.)* А як можна адным словам назваць нашых бабуль і дзядуляў? *(Продкі.)*

Так, у кожнага з нас ёсць папярэднікі, свае продкі, далёкія і блізкія родзічы ды сваякі. Інакш кажучы, кожны з нас мае свой радавод.

Паслухайце верш Яўгена Пясецкага «Мой радавод».

Каб калыскі сваёй не забыцца,
Каб не счэзнуць сярод нягод,
Прахалодай спрадвечнай крыніцы
Наталі мяне, мой радавод.

Маю памяць стагоддзям не вынішчыць,
Маёй сцежкі не звесці ў прыгнёт —
Ад маны і ад лёсу рабыніча
Беражы мяне, мой радавод.

У валошках, якім не выцвісці,
Ў вольных спевах вясновых чарод,
Ў Божай міласці, ў людской шчырасці
Будзе доўжыцца мой радавод.

- З якой думкай напісаў аўтар гэты верш? *(З думкай пра сваіх продкаў, іх спрыянне і апеку.)*

• Чаго больш за ўсё жадаецца яму? *(Аўтар жадае, каб доўжыўся яго род на зямлі продкаў.)*

Настаўнік *(працягвае).* Такое ўражанне, быццам наш клас запоўніўся самымі блізкімі людзьмі. Кожны з вас, напэўна, хацеў бы сказаць словы падзякі сваім родным.

Скажыце, калі ласка, за што вы можаце падзякаваць сваім бабулям, дзядулям, прабабулям. *(Адказы вучняў.)*

Звярніце ўвагу на дошку. Эпіграфам нашага ўрока з'яўляюцца наступныя словы: ***«Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў...».*** З якога літаратурнага твора ўзяты гэтыя радкі? *(З казкі Уладзіміра Караткевіча «Нямоглы бацька».)*

Так, са зместам гэтай казкі мы пазнаёміліся на мінулым уроку, А вось чым будзем займацца сёння, вы мне зараз дапаможаце вызначыць.

У якасці тэмы ўрока я абрала радкі з тэксту казкі: «І так памёр Закон стары. І так стаў новы Закон»

Як вы думаеце, аб чым мы з вамі будзем весці гутарку? *(Мы будзем гаварыць аб тым, што гэта за стары Закон і чаму ён памёр, і які Закон прыйшоў на змену старому Закону.)*

**II. Аналіз казкі.**

Настаўнік. Дома вам трэба было яшчэ раз уважліва перачытаць змест казкі, вызначыць часткі згодна складзенаму на мінулым уроку плану. Наколькі вы былі ўважлівымі пры выкананні гэтага задання, мы зараз высветлім.

***Першае заданне.*** Перад вамі на сталах карткі з урыўкамі з тэксту. Прапаную вам узнавіць у памяці гэтыя радкі і ўставіць прапушчаныя словы.

Быў калісьці — так даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым Небе, — у людзей на зямлі такі ... звычай: не карміць старых бацькоў.

... былі людзі.

*(У тэксце прапушчаны словы «паганы», «дзікія».)*

***Другое заданне.*** «Паганы» быў Закон. Раскажыце (перакажыце ўрывак з тэксту), калі ласка, што ж гэта быў за закон, у чым была яго сутнасць.

Дзікія былі людзі. Дзікія-найдзікія. Аж цяпер сорамна ўспамінаць пра іх, такія дзікія. Як убачаць, што маці або бацька больш ахвотна на сонейку грэецца, чым косіць ці жне, дык адразу завозяць іх на калёсах або на санях у глухі лес, пакідаюць трохі ежы і едуць дахаты. А калі тыя хлеб з'ядуць, то або памруць з голаду, або застынуць, або дзікая зверына іх разарве.

Такі быў Закон.

***Трэцяе заданне.*** І сапраўды, закон быў «паганы». Падбярыце, калі ласка, да прыметніка «паганы» блізкія па значэнні словы. Як яшчэ можна назваць гэты Закон? *(Закон (звычай) — паганы, дзікі, жорсткі, бязлітасны, нялюдскі і інш,)*

***Чацвёртае заданне.*** Калі мы знаёміліся са зместам казкі, то склалі план, і

першы пункт яго так і называўся — «Закон карысці». Дапамажыце мне, калі ласка, аднавіць паслядоўнасць усіх пунктаў плана. *(Вучні працуюць па ланцужку, па чарзе падыходзяць да настаўніцкага стала, выбіраюць і замацоўваюць на дошцы наступны пункт плана.)*

*Закон карысці*
*Спрэчка Пятра і Гната*
*«Прыняў іх чорны лістападаўскі лес»*
*«Гарыць агонь у лесе»*
*Парады нямоглага бацькі*
*«Шануйце нямоглую мудрасць»*

***Пятае заданне.*** Паганы, дзікі, жорсткі Закон выпрабоўвае трох герояў. Паслухайце радкі з тэксту, пазнайце і назавіце героя, растлумачце, як гэтыя радкі характарызуюць адносіны герояў да старога Закона.

1)«Няма чаго ў рот валачы, калі барану валачыць не можаш.» *(Гнат.)*
2)«— Ты чаго гудзіш, як свіння?.. Чаго так пільна хочаш? Крыві чужой?» *(Пятро.)*
3)«І мы ўсе, хто на парозе, — перад дарогаю ў лес — вырашалі патаемна: лепей ужо там легчы, чым ад сваіх...» *(Бацька.)*

***Шостае заданне.*** Пра каго з герояў казкі Уладзімір Караткевіч сказаў: ***«...Як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон»*** *(Пра Гната.)*
А хто быў супраць гэтага Закона? *(Пятро.)* Знайдзіце ў тэксце і прачытайце па асобах спрэчку Пятра і Гната. *(С. 94—95.)*

***Сёмае заданне.*** Звярніце ўвагу на дошку, на ёй размешчана ілюстрацыя да казкі і вашы малюнкі да эпізодаў, якія вам больш за ўсё спадабаліся.

Уважліва разгледзьце ілюстрацыю і скажыце, ці перадаў мастак вобраз нямоглага чалавека. Па чым мы можам пра гэта меркаваць? *(Чалавек ледзьве сядзіць на возе, схуднелы, твар маршчыністы.)*

Настаўнік. Так, сапраўды. Нават вопратка гаворыць пра тое, што чалавек «знасіўся».

У адрозненне ад мастака, пісьменнік малюе свае карціны словамі. Як жа аўтар апісвае знешні выгляд бацькі? Знайдзіце і зачытайце радкі з тэксту. *(С. 90: «Зірнуў Пятро на бацьку...».)*

### III. Фізкультхвілінка.

Настаўнік. Мы пабачылі, як намаляваў нямоглага чалавека мастак, як апісаў пісьменнік. Цяпер прапаную вам таксама перадаць вобраз нямоглага чалавека, толькі пры дапамозе рухаў. А каб мы маглі з вамі ўбачыць розніцу паміж нямоглым і моцным чалавекам, вы будзеце паказваць дзеянні так, як бы іх мог выканаць бацька, а як Пятро.

- Узяў бацька касу і пайшоў на луг.
- Побач з ім, ускінуўшы касу на плячо, ішоў Пятро.
- Навастрыў бацька касу.
- І Пятро зрабіў тое ж.
- Пачаў бацька касіць, стаміўся, спыніўся, уздыхнуў.

- ❖ А Пятро ўсё косіць, спыніўся на хвілінку, выцер пот з ілба, азірнуўся навокал, убачыў, што бацька стаміўся, і вырашылі яны адпачыць.

Сядайце, калі ласка. Скажыце, каму было лягчэй працаваць. Які мы можам зрабіць з гэтага вывад? *(Трэба дапамагаць старэйшым у працы.)*

**IV. Працяг аналізу казкі.**

***Восьмае заданне.***

Настаўнік.А цяпер давайце з вамі крышку пафантазіруем. Уявім, што жыццё — гэта акіян. І раптам у гэты акіян Жыцця ўрываецца Закон і рассяляе нашых герояў па трох астравах. Вось гэтыя астравы: востраў Жорсткасці, востраў Мудрасці, востраў Адвагі.

• Ці адпавядаюць паводзінам і ўчынкамгерояў казкі гэтыя назвы? *(Так.)*

• Рассяліце герояў па астравах. *(Востраў Жорсткасці — Гнат, востраў Мудрасці — бацька, востраў Адвагі — Пятро.)*

• Чаму вы пасялілі Пятра на Востраў Адвагі? *(Адказы вучняў.)*

• Каму з герояў вы далі б лодку, каб ён не загінуў адзін на востраве? Чаму? *(Адказы вучняў)*

***Дзявятае заданне.*** Праца ў парах па картках.

З пералічаных рыс характару выберыце і падкрэсліце тыя, якія характарызуюць: а) Гната; б) Пятра; в) бацьку.

Добры, злосны, разумны, грубы, смелы, жорсткі, крыклівы, мудры, міласэрны, уважлівы, кемлівы, бессардэчны, літасцівы, рашучы.

• Вы адзначылі, што бацька быў мудры, разумны. У чым і як дапамагла бацькава мудрасць?

***Дзясятае заданне.*** Якія мудрыя словы сказаў сын у апраўданне перад грамадой? Знайдзіце і зачытайце іх. Як вы разумееце іх сэнс?

Жылі сілай, а розум забывалі. Жылі сённяшняй карысцю. Знішчалі «ўчора» І таму не мелі права на «заўтра».

• Што такое ўчора? *(Старыя, мудрыя людзі.)*

• Што такое заўтра? *(Моладзь, дзеці.)*

Калі знішчаць бацькоў, саму мудрасць, што ж застанецца дзецям?

**V. Падвядзенне вынікаў урока, рэфлексія.**

- ✓ Ці згоднывыз выразам “ Казка - добрая падказка”? (*Казка - урок мудрасці, дабрыні, любові)*
- ✓ Якую падказку робіць нам У. Караткевіч*? (Трэба шанаваць сваіх бацькоў, берагчы іх, быць добрымі, чулымі, міласэрнымі)*

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на словы У. Караткевіча, запісаныя на дошцы ў якасці эпіграфа.

***Адзінаццатае заданне.*** Згадайце дзве-тры прыказкі, якія адпавядаюць тэме твора.( *Хто бацькоў не шануе, той сабе такую ролю рыхтуе. Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш. Старасць не радасць.)*

***Дванаццатае заданне.*** Казка заканчваецца словамі: “І так памёр Закон стары. І так стаў новы Закон”. Пры дапамозе дзеясловаў, запісаных на

дошцы, складзіце пункты новага Закона.

Паважайце …
Цаніце …
Беражыце…
Дапамагайце …
Прыслухоўвайцеся …
Віншуйце …
Наведвайце...

Настаўнік.

Павагай да людзей і ў дзень будзённы,
І ў святы хай напоўніцца твой дом.
Тады парог не пераступяць беды,
Сяброўскіх рук адчуеш ты цяпло,
Жыві, твары і мудрасць продкаў ведай:
Пасей дабро — тады пажнеш дабро.

**VI. Выстаўленне адзнак.**

Самаацэнка з каментарыямі настаўніка.

**VII. Дамашняе заданне** (на выбар вучняў).

1) Падрыхтуйце вусны пераказ казкі.

2) Распытайце ў бабуль і дзядуляў пра іх жыццё і напішыце міні-сачыненне «Мая бабуля (Мой дзядуля)».

Падрыхтуйце вусны аповед «Мінулае нашай сям'і» паводле фотаздымка з сямейнага альбома.

1. Быў калісьці — так даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым Небе, — у людзей на зямлі такі ... звычай: не карміць старых бацькоў.

... былі людзі.

4. *Закон карысці*

*Спрэчка Пятра і Гната*

*«Прыняў іх чорны лістападаўскі лес»*

*«Гарыць агонь у лесе»*

*Парады нямоглага бацькі*

*«Шануйце нямоглую мудрасць»*